View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository



Леська Л.П. (Беларусь. Мінск).

**Вобраз “гаспадара” ў мастацкім свеце Яна Баршчэўскага**

Вобраз гаспадара ў мастацкім свеце Яна Баршчэўскага як асобная праблема не даследаваўся. Хаця айчынныя і замежныя навукоўцы прама, або ўскосна звярталіся да гэтага пытання пры раскрыцці праблемы нацыянальнай незалежнасці і эканамічнай свабоды беларусаў і, наогул, свабоды чалавека. У сувязі з гэтым прыгадаем слушныя назіранні М.Хаўстовіча, які неаднаразова заўважаў што ў Яна Баршчэўскага беларус не адчувае сябе гаспадаром зямлі беларускай, дзе паўсюль «валадараць незнаёмцы, дзіўныя людзі, чарнакніжнікі”, а Васіль з апавядання “Зухаватыя ўчынкі”, ці Міхась з апавядання “Вужовая карона” адракаюцца ад сваіх і накіроўваюцца на пошукі тых, каму патрэбна ягоная служба, ідуць у асяроддзе нячыстай сілы.

М.Гарэцкі і М.Грынчык разбурэнне чужой гаспадаркі ў паэме “Рабункі мужыкоў” ацанілі як ганебны ўчынак Мінкі, а В.Каваленка, у адрозненне ад сваіх папярэднікаў,- смелага лідэра вясковай грамады не лічыць адмоўным персанажам. Падобнай думкі прытрымліваецца У.Мархель, які вызначыў у паэме “Рабункі мужыкоў” разняволенне духу, як “пераадоленне персанажамі чагосьці ў сабе і нават не бунтам, а рабаваннем панскай маёмасці, якое дае на нейкі час адчуванне свабоды …”(,с.21). Так была ўстаноўлена сімвалічная сувязь паміж ідэальным і матэрыяльным планам у мастацкім свеце Яна Баршчэўскага.

Задача нашай працы-асэнсаваць вобраз гаспадара як сувязны момант паміж рэальным і ўяўным светам у творах Яна Баршчэўскага.

Выраз “гаспадар” мы ўжываем у двух сімвалічных значэннях, па-першае – гэта чалавек моцны Духам, валадар сваёй душы, Богападобны. І разам з гэтым у Я.Баршчэўскага, гаспадар-працаўнік на зямлі, якога хвалююць разнастайныя “гаспадарчыя клопаты”.

Адной з праяў «уяўнага» ў зборніку “Шляхціц Завальня…”, аповесці “Душа не ў сваім целе”, і паэме “Жыццё сіраты” Яна Баршчэўскага з'яўляецца таямнічае “жыццё Духа”, няўлоўныя “пералівы” чалавечай душы.

У мастацкім космасе “Шляхціца Завальні…” пануюць разнастайныя духі, сам аўтар заўважае: “можа, гэта камусьці здалося; можа, гэта праява злых духаў, а можа, проста фантазія беларускага народа, якому заўсёды мрояцца чары і духі ў размаітых постацях, і ў кожнай з гэтых істотаў свой абавязак: духі водныя, духі зямныя, хатнія, вартаўнікі лясоў і скарбаў…” (,139). Пісьменнік не толькі падаў сістэму духаў, але і даследаваў суіснаванне гэтых тонкіх субстанцый з чалавекам у апавяданнях “Зухаватыя ўчынкі”, “Вужовая карона”, “Вогненныя духі”, “Рыбак Родзька”, “Валасы, якія крычаць на галаве” і інш.

У апавяданні “Зухаватыя ўчынкі”аўтар намаляваў вобраз лясуна, якога ўбачылі сяляне. Ахоўнік лесу ішоў па бары, вышэйшы за ўсе дрэвы. Здзіўлены народ захапляўся велічнасцю лясуна, яго ростам і натуральнай блізкасцю з прыродай і толькі зухаваты Васіль «пацэліў у яго каменем”. Малады чалавек на кароткі час адчуваў сябе гаспадаром над прыродай, але хутка яму пачынае не шанцаваць на ўласнай гаспадарцы. “Выганяць пастухі чараду за вёску ў поле, выбяжыць з лесу воўк, схопіць барана; калі разгледзяцца, дык бачаць, што той баран быў Васілёў. Карова ягоная раз заблудзілася каля возера, убілася ў балота, пакуль прыбеглі на дапамогу, ужо ўтапілася…”(,с.120). Гаспадарчыя няўдачы прывялі Васіля да роспачы, ён адышоў ад Бога, ад праведнага жыцця, вырашыў пакланіцца нячысціку і шукаць лёгкіх грошай, інакш кажучы, страціў моц свайго духа. Уласную душэўную свабоду страчвае і Генрык з апавядання “Валасы, якія крычаць на галаве”, ён бяздумна патрапіў пад уплыў страшнага чарнакніжніка, забыўся на веру ў Бога, не ўшаноўвае і народныя вераванні, разбурыў каплічку і могільнік, загубіў сваю жонку Амелію. Далікатная жанчына засталася ўладаркай сваёй душы. Амелія адпакутавала і, хутчэй за ўсё, атрымае жыццё вечнае, як і дзед Гараська з апавядання “Стогадовы стары і чорны госць”, што пражыў доўгае праведнае жыццё і меў узнагароду ад Бога.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У апошнія хвіліны зямнога жыцця душа старога чалавека, ужо не абцяжараная целам, бесперашкодна вандруе па мясцінах, дзе дзеду Гараську было добра, дзе яго зычліва прыймалі.

Моцны духам дзед Гараська страчвае цялесную абцяжаранасць, а мізэрная і жорсткая душа пані з апавядання “Кабета Інсекта” набывае непрывабную цялесную абалонку. Кабета Інсекта была багатай жанчынай, але яе жорсткасць не мела межаў, яна гневалася без асаблівых прычын, рабіла шмат зла, злосць высушыла цела і пакрысе жанчына ператварылася ў насякомае, у нейкую злосную інсекту і толькі малітвы ў Полацкім кляштары выратавалі грэшніцу, яна быццам лёгкакрылы анёл адляцела ў райскія вышыні. Малітвы робяць цуды і вялікая грэшніца набывае жыццё вечнае.

Малітвы робяць шляхціца Завальню, рыбака родзьку і пана Зямельскага “чарадзеямі духу і чарадзеямі нівы”. Завальня –добры гаспадар, які мае наладжаную гаспадарку, прыроджаную душу паэта, хоць сам і не пісаў, але кожную ноч слухаў фантастычныя апавяданні. Завальня самастойна ўзмацніўся, ён не атрымаў ад бацькоў спадчыну, але шмат працаваў, шчыра верыў у Бога, меў у душы вялікую любоў да чалавека, валодаў чуйным прадчуваннем прыродных змен і яго праца ў хуткім часе дала добры плён. Былы беззямельны юнак, Завальня, як пайшоў у свет у сваім адзіным новым капоце, стаў сталым гаспадаром, які абыходзіць свае ўладанні ўжо ў добрым футры і прыгожай шапцы. Ян Баршчэўскі ўскладвае надзеі на такія гаспадаркі, як у Завальні, на такі райскі востраў, на якім валадарыць рыбак Родзька. Завальня любіць Родзьку. “Пабудзеш на яго востраве – адразу відаць, што жыве там чалавек гаспадарлівы і дбайны. Яго дамок (хоць не такі ўжо прасторны ды і саломаю крыты) стаіць на ўзгорку ў маляўнічай мясціне, ёсць пры ім і маленькі садок: яблыні і вішні. …Поле ўгноена як сад…(1,с.152). Гаспадарку-востраў атрымаў і сляпы Францішак.”- Дзякуй Богу, апавядае Францішак, - маю дабрадзеяў і ў гэтых краях. Вось пан Б. падараваў мне выспу ў сваім маёнтку на возеры Рабло. Там у мяне дамок, сад і маленькая гаспадарка….”(1,с.164) Астраўком дабрабыту ў аповесці “Душа не ў сваім целе” валодае гаспадар Гайнар. Саматніцкі згадвае, як вандруючы па стэпу, ён убачыў дрэвы адзінокага хутара; наблізіўшыся да гэтае мясціны, не заўважыў аніякае агароджы, не спаткаў аніводнага чалавека, нават сабака не абазваўся каля самотнае хаціны, а ў цяні садовых дрэваў паўсюль панавала ціша. У адрозненне ад гаспадаркі Завальні, якая была прыкрытая лесам, схаваная ад чужога позірку, або гаспадаркі Родзькі, што знаходзілася ў шчыльным атачэнні вады, гаспадарка Гайнара (“Душа не ў сваім целе”) не мае агароджы, яна адкрытая. Саматніцкі бачыць, як хлапец разбудзіў гаспадара гэтай першаснай некранутасці, “быў той ужо ў гадах, апрануты ў белую палатняную вопратку” (1,с.323). Магчыма, гэтае адзенне сімвалічна сведчыць пра выключную духоўнасць гаспадара, яго праведнасць.Гаспадар Гайнар, як і яго папярэднікі Завальня, Родзька, прапаведуе ідэю наследавання прыродзе, яго хвалюе пытанне суладнага і гарманічнага жыцця чалавека і прыроды.

Ян Баршчэўскі стварыў паўнакроўны вобраз гаспадара, раскрыў яго духоўны свет падаў мадэль “дзяржаўнага гаспадарання”, закрануў праблему паступовага разбурэння гаспадарак. Бедны працаўнік у апавяданні “Гаспадарчыя клопаты” зазначае: “- у нас адна бяда не ходзіць, няшчасці з розных бакоў нападаюць на чалавека так, што ўсё з рук валіцца і няма надзеі калі-небудзь адпачыць пасля цяжкае працы. Мой сын, жывучы цэлую зіму ў горадзе, зарабіў дзесяць срэбных рублёў. За гэтыя грошы я цяпер у Полацку купіў насення. Дзякуй Богу, маю што пасеяць. Але хто будзе араць ніву?”(1,с.277).

Літаратура:

1.Баршчэўскі Я. Выбранныя творы / Укладанне, прадмова і каментарыі М.Хаўстовіча – Мн.: “Беларускі кнігазбор”, 1998. 480с.

2.М.М.Грынчык. Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі, Мн., навука і тэхнік, 1963.

3. В.Каваленка. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Развіццё беларускай літаратуры 19-20 стагоддзяў. Рэд. П.К.Дзюбайла. Мн., "Навука і тэхніка".

4.Макарэвіч А.М. Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе 19-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пачатку 20 стагоддзя. Манаграфія. – выдавецтва Магілёўскага дяржаўнага уіверсітэта імя А.А. Куляшова, 1999. – 332с.

5. Мархель У. Праца духу –дзеля любові // Мархель прысутнасць былога: Нарысы. артыкулы, эсэ. Мн.,1997.

5.Тычына М.А. Карані і крона: Фальклор і літаратура / М.А. Тычына.- 2-е выданне - Мн.: Бел. навука, 2002. - 197 с

6.Штэйнер І.Ф. Беларуская балада: Вытокі жанру і паэтычная структура. - Мн.: Навука і тэхніка, 1989. - 143 с.

7.М.Хаустовіч ("На парозе забытае святыні: Творчасць Яна Баршчэўскага. Мн.: ВТАА "Права і эканоміка", 2002.-186с.)

8.Хаўстовіч М.В. Мастацкі метад Яна Баршчэўскага / М.В. Хаустовіч. - Мн.: БДУ,2003. - 203с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гаспадарчыя клопаты, гаспадар і новая гаспадарка, разбурэнне гаспадарак, гаспадарка-востраў. Гаспадар Завальня гаспадар Родзька, гаспадар Зямельскі, гаспадар Рылец.разбудзіў гаспадара (,с.323).

- Рандар! Рандар! Адчыні вароты; ахці, якая мяцеліца, саўсмём перазяблі, і коні прысталі, чуць цягнуць: рандар, рандар! Адчыні вароты!
- Словы сінонімы паночык – гаспадар, але маёмасная перавага не значыць, што чалавек добры гаспадар. У баладзе баярын, гаспадар і уладальнік прайграўся ў карты і прадаў душу Альдзе, д'яблу, ён ужо не гаспадар. Вобраз гаспадара падаецца як урыўкава, так і разгорнута. Антон у апавя

Ідэя гаспадара праяўлена ў аповесці "Хам " Э.Ажэшкі. Павел Кабыцкі натуральны чалавек, ён зліваецца З воднай прасторай Нёмана, прырода дае яму маральную чысціню, імкненне да чыстага пачуцця і нават здольнасць перавыхоўваць гераіню Франку. Павел Ка0быцкі- працаўнік, ён гаспадар свайго духу, сваёй душы, якая ў пакутах мацнее, ачышчаецца і становіццв вялікадушнай, ён даруе сваёй жонцы, нават яе злосны учынак, замах на забойства, а Завальня ў Баршчэўскага таксама гаспадар, які набыў гаспадарку ўласнай працай, яна яму не была дадзена ад продкаў, не засталося яму спадчыны ад бацькоў, ён пайшоў у свет шмат старанна працаваў і атрымаў свой набытак.

Завальня шляхціц, за якім будучыня, ён працуе і спадзяецца на плён працы сваіх. Завальня адрозніваецца ад Карчынскіх з рамана "Над Нёманам" Ю.І.Крашэўскага.

Супярэчлівасць у трактоўцы вобраза. Аўтар надзяліў красамоўным прозвішчам Завальня, Завала, заваліцца на печ, ляжыць і слухае, на першы погляд, падасца, што сваім ляжачым станам Завальня належыцца да Абломавых, але ён дзейнічае, не лянотна адпачывае, ён працуе разумова, праслухоўвае фантастычныя апавяданні, дае каментарый, арганізоўвае. Гаспадар духу, гаспадар уласнай Зямлі, Гаспадар становішча.

Ян Баршчэўскі у зборніку "Шляхціц Завальня", Аповесці "Душа не ў сваім целе" і паэме "Жыццё Сіраты" падае разгортванне вобраза гаспадара. Дзве сэнсавыя мяжы мае гэтае паняцце. Гаспадар у "Шляхціцу Завальню" - гаспадар прыроды, Лясун, спакой якого парушае зухаваты Васіль. У гэтым апавяданні перададзена пантэістычнае пакланенне чалавека перад прыродай, чалавек замірае перад велічнасцю прыроды, ён не адчувае гаспадаром над ёй, такое "Гаспадаранне" прыводзіць чалавека да роспачы.

Другое бачанне гаспадара - гэта калі чалавек адчувае гаспадаром уласнай душы, гаспадар духу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Штэйнер І.Ф. Беларуская балада: Вытокі жанру і паэтычная структура. _ Мн. : Навука  і тэхніка, 1989. - 143 с.

Завальня, якім ён бачыцца М.А. Тычыне Тычына М.А. карані і Крона: Фальклор і літаратура / М.А. Тычына.- 2-е выданне - Мн.: Бел. навука, 2002. - 197 с.

Сувязь аповесці Яна Баршчэўскага "Шляхціц Завальня" з народна-фантастычнымі формамі празаічнага апавядання відавочная. сам вобраз Завальні ўзяты , можна меркаваць па біяграфіі аўтара, з рэальнага жыцця, традыцыйны ў беларускім фальклоры: пан аматра казак - геой казак "Не люба -не слухай!", "Пан і казачнік". Але і грамадскі  ідэал часу знайшоў ўвасабленне. Пан Завальня у адрозненне адказачнага пана, перамога над якім кемлівага мужыка чакаецца з радасцю, "

меў у сэрцы любоў да бліжняга".

Вядома, шляхціц Завальня прадстаўнік шляхты. Паміж  ім і простым чалавекам ляжыць сацыяльная мяжа, якую аднак ён імкнецца пераадолець. Захапляе Завальню ўсё, у чым ёсць праява чалавечнасці.

Паляпшэнне спраў у гаспадарцы Ян Баршчэўскі звязвае з карыслівым разлікам. Генрык паляпшае сваё становішча і жэніцца На Амеліі, дачцэ кіраўніка маёнтка, хаця яна не мела высокага паходжання, але мела добры пасаг, добрае выхаванне. Пры раскрыцці праблемы гаспалара ўзвялічваецца просты чалавек, няма такого рэзкага адмежавання, што шляхта, гэта толькі добрае, альбо злое, але некаторыя шляхціцы заўважаюць, што паны паспрыялі таму, што ў нашым краі развялося шмат нячысцікаў.В.Каваленка заўважаў  ў сваёй працы Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Развіццё беларускай літаратуры 19-20 стагоддзяў. Рэд. П.К.Дзюбайла. Мн., "Навука  і тэхніка",1975) с.153. .... Халодны разлік уласцівы не толькі адмоўным персанажам, але і зусім прыстойным людзям, дадатным персанажам Петруку і Марысі.Як і Сабковіч , так і Пятрук збіраюцца жаніцца з разлікам. Ім падабаюцца выбранніцы, але пачуццё кахання спалучаецца у іх з меркантыльнымі інтарэсамі. Толькі маштаб прэтэнзій у іх розны. Сабковіч хоча стаць багатыром, А Пятрук прыстойным гаспадаром. Але сацыяльная прырода іх імкненняў аднолькавая. Нават у каханні Марысі на першы плане не чыстае пачуццё,  а гаспадарчыя  клопаты. Калі Пятрук просіць  у Марысі дазволу пацалаваць яе, яна адказвае: "Пачакай крыху! Як павянчаемся, тады цябе пацалую, - цяпер жа не йдзе! Бог будзе гневацца і ў гаспадарцы не пашанцуе".

У паэме "Рабункі мужыкоў" апісаны захоп сялянамі панскага маёнтку, разбурэнне чужой гаспадаркі.На нашу думку, некаторыя даследчыкі  беларускай літаратуры  зніжаюць сацыяльнае гучанне гэтага твора , сцвярджаючы, што аўтар з непрыязнасцю паказвае  сялянскага верхаводца  Мінку, быццам акарыкатурвае вобраз М.М.Грынч(ык . Фальклорныя традыцыі ў белварускай дакастрычніцкай паэзіі,стр.45.), а мы пагодзімся не з шаноўным В.Каваленкам, А з Грынчыкам, бо разбурэнне чужой гаспадаркі справа ганебная.

праўда, як заўважыў В.Каваленка "у некаторых апавяданнях  “Шляхціца Завальні…"  селянін вымушаны  ісці на саюз з нячыстай сілай пад націскам паноў, іх прагных інтарэсаў.

аказваецца, зусім не ідэалізуе Баршчэўскі сацыяльнае быццё чалавека ў мінулым, паказвае, што і тады панавала несправядлівасць, людзі гінулі ў кайданах. І калі  (,см.85)

"Пан Марагоўскі, па словах М.Хаустовіча, з'яўляецца аднадумцам шляхціц Завальні і хоць ён не расказвае гісторый, але жыве  гэтымі фантастычнымі гісторыямі"А ці любіць  нашыя беларускія казкі , - пытаецца ён пра Янку, і ў яго словах гучыць замілаванне "казачнаю атмасфераю". "Ён ведае, наколькі  патрэбны маладому пакаленню  "казкі" - гістарычная памяць, а таму садзейнічае, каб гучалі апавяданні пра мінулае,с.96.(Хаўстовіч М.В. Мастацкі метад Яна Баршчэўскага / М.В.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Хаустовіч. - Мн.: БДУ,2003. - 203с.

А яж пану пакланюся: панок, маё гора,
Жыта касіў, сена грабіў цэлы дзень учора.
Вось тут пан прасціць і міласць пакажаць,
Яшчэ хлопцу чарку водкі мне пранесць прыкажаць.

Так атрымоўваецца па-роознаму ацэньваецца паэма “Рабункі мужыкоў”, Максім Гарэцкі, М.Грынчык ва ўчынку Мінкі ўбачылі ганебнасць, разбурэнне чужой гаспадаркі, В.Каваленка падкрэсліз гераічнасць учынкаў Мінкі, яго смеласць, бунтарскі характар, гераізм.

Отходит от патриотического дела, в котором учавствовал в молодости Бенедзикт Корчинский Погружённый в заботы о поместье, о получении необходимых доходов, он загрубел, порывает с идеалами и для соседей Богатыровичей становится притеснителем.Владельца Корчина осуждает и иего родной сын Витольд., и помещик осознаёт свою непрвавоту , идёт на уступки с соседям.

вобраз Гаспадара ў Баршчэўскага. Асноўныя тэзісы, Гаспадар душы і цела, волат духу, гаспадар Зямлі, і гаспадар ліры, гаспадар арфы.

Гаспадарка і гаспадарчыя клопаты, як стаць гаспадаром, чалавек прыродны Павел Кабыцкі і шляхціц Завальня.

). М.Хаўстовіч даследуе прычыны, “з-за якіх беларус мусіць (ці то вымушаны) ісці на службу да прыхадняў-чужынцаў. На гэты раз асноўная ўвага звяртаецца на праблему залежнасці селяніна-прыгоннага ад пана, на несправядлівыя адносіны ўладароў гэтага свету да прыгнечаных. Відавочна, Я.Баршчэўскі бачыў у гэтай несправядлівасці адну з прычын, па якой чалавек ішоў на кантакт з “нячыстаю сілаю”(,90). М. Хаўстовіч разважае, што выспа Родзькі для Я.Баршчэўскага не ідэальная сялянская гаспадарка, але мадэль (зрэшты амаль не развітая) дзяржаўнага самаўладкавання беларусаў. Дадзеная трактоўка гэтага вобраза грунтуецца на цэласным аналізе мастацкай сістэмы твора. Толькі ўлічыўшы шматаспектную значнасць апазіцыі “сваё-чужое”, можна ўспрыняць дадзены малюнак як сімвалічны, можна ў гаспадарцы Родзькі бачыць гаспадарствам Беларусь. (Цікава, што і сляпы Францішак пасяляецца на востраве). (,с.104).

1.М.Хаустовіч (“На парозе забытае святыні: Творчасць Яна Баршчэўскага. Мн.: ВТАА “Права і эканоміка”, 2002.-186с.)

2.(Хаўстовіч М.В. Мастацкі метад Яна Баршчэўскага / М.В. Хаустовіч. - Мн.: БДУ,2003. - 203с.

вобраз

3.М.М.Грынч(ык . Фальклорныя традыцыі ў белварускай дакастрычніцкай паэзіі,стр.45.)

.4.В.Каваленка. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Развіццё беларускай літаратуры 19-20 стагоддзяў. Рэд. П.К.Дзюбайла. Мн., "Навука і тэхніка",1975) с.153.

5.Тычына М.А. карані і Крона: Фальклор і літаратура / М.А. Тычына.- 2-е выданне - Мн.: Бел. навука, 2002. - 197 с

6.Штэйнер І.Ф. Беларуская балада: Вытокі жанру і паэтычная структура. _ Мн. : Навука і тэхніка, 1989. - 143 с.

7.Макарэвіч А.М. Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе 19-пачатку 20 стагоддзя. Манаграфія. – выдавецтва Магілёўскага дяржаўнага уіверсітэта імя А.А. Куляшова, 1999. – 332с.

Мархель У. Праца духу – дзеля любові. Ян Баршчэўскі. Вяртанне спадчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“На нашу думку, некаторыя даследчыкі беларускай дарэвалюцыйнай літаратуры зніжаюць сацыяльнае гучанне гэтага твора, сцвярдаючы, што аўтар з непрыязнасцю паказвае сянскага верхаводца Мінку, быццам акарыкатурвае яго вобраз…. Параўнанне Мінкі з сокалам, параўнанне, якое звязана з устойлівай фальклорнай паэтызацыяй, непрыхаванае захапленне героем, рэзка супярэчыць адмоўнай характарыстыцы.

Незаўважна для саміх сябе навукоўцы паставілі пытанне пра чалавека як гаспадара свайго

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ